УДК 37.013.8:392.1(=161.3)

# Выхаваўчы патэнцыял беларускіх народных традыцый па фарміраванні сямейнай культуры сучаснай моладзі

**Сочнева А.С.**
*Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", Мінск*

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці народнай культуры, вызначаецца іх роля ў фарміраванні сямейнай культуры сучаснай моладзі. Дзяржаўная сямейная палітыка як адна з прыярытэтных задач ставіць захаванне шлюбна-сямейнага інстытута, дзе традыцыйная культура з'яўляецца асновай для выхавання падрастаючага пакалення. Захаванне традыцый народнай культуры разглядаецца сёння ў якасці базавай перадумовы духоўнай бяспекі грамадства, а айчынная культура ўсведамляецца як найважнейшая ўмова развіцця асобы моцнай і незалежнай нацыі. Сям'я з'яўляецца носьбітам традыцыйнай культуры, дзякуючы якой адбываецца першая сацыялізацыя асобы, захоўваецца пераемнасць пакаленняў. Актуалізуецца тэма фарміравання сямейнай культуры сучаснай моладзі для педагагічнай навукі. Вывучаюцца пытанні выхавання сучаснай моладзі на аснове беларускіх народных традыцый. Аўтар дае азначэнне паняццю "выхаваўчы патэнцыял беларускіх народных традыцый" і вызначае яго структуру. Разглядаюцца асаблівасці сямейнай абраднасці праз вясельныя, радзільныя і памінальныя традыцыі народа. У дадзенай публікацыі прадстаўлены аналіз нормаў і правілаў народнай педагогікі, разгледжаны святы беларускага календара. Выхаваўчы патэнцыял беларускіх народных традыцый даследчык бачыць у пераемнасці пакаленняў, традыцыйных святах беларускага народнага календара, традыцыях сямейнай абраднасці, правілах народнай педагогікі.*

***Ключавыя словы:*** *сям'я, сямейная культура, беларускія народныя традыцыі, сямейная абраднасць, народная педагогіка, беларускі народны каляндар.*

*(Искусство и культура. – 2022. – № 1(45). – С. 78–82)*

# The Eductional Potential of Belarusian Folk Traditions in Shaping Family Culture of the Contemporary Youth

**Sochneva E.S.**
*Education Establishment "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk*

*The article examines the features of folk culture, determines their role in shaping family culture of the contemporary youth. The state family policy sets one of the priority tasks to preserve the marriage and family institution, where traditional culture is the basis for the upbringing of the younger generation. Preservation of folk culture traditions is considered today to be the basis for the society spiritual security, while domestic culture is regarded as an important condition for personality development, for the strong and independent nation. The family is a carrier of traditional culture, where the first socialization of the individual takes place, the continuity of generations is preserved. The topic of shaping family culture of modern youth for pedagogical science is updated. The issues of education of the contemporary youth on the basis of Belarusian folk traditions are studied. The author identifies the concept of "educational potential of Belarusian folk traditions" and defines its structure. The features of family rites through the wedding, maternity and memorial traditions of the people are considered. The paper presents an analysis of the norms and rules of folk pedagogy, considers the holidays of the Belarusian calendar. The researcher sees the educational potential of Belarusian folk traditions in the continuity of generations, the traditional holidays of the Belarusian folk calendar, the traditions of family rituals, the rules of folk pedagogy.*

***Key words:*** *family, family culture, Belarusian folk traditions, family rituals, folk pedagogy, Belarusian folk calendar.*

*(Art and Cultur. – 2022. – № 1(45). – P. 78–82)*

Захаванне, вывучэнне і адраджэнне беларускіх народных традыцый – гэта адна з найважнейшых умоў фарміравання гарманічнай нацыі на сучасным этапе развіцця грамадства, калі адбываецца паслабленне пераемнасці пакаленняў, назіраецца запазычанне заходняй культуры і г.д.

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: lena.motuzenko@mail.ru – Сочнева А.С.*

Сучаснае беларускае грамадства немагчыма ўявіць без звароту да вытокаў, спасціжэння і прыняцця каштоўнасцей нацыянальнай культуры. Менавіта нацыянальная культура, яе мудрасць робяць нас адзінымі, непадобнымі на іншых, са сваёй культурай, мовай і поглядамі на жыццё, прыроду, грамадства і чалавека. Народная культура ўтрымлівае разнастайныя традыцыі, якія ўяўляюць сабой велізарны выхаваўчы патэнцыял у фарміраванні грамадска значных якасцей асобы і тым больш яе сямейнай культуры. У сям'і як найважнейшым сацыяльным інстытуце закладваюцца нормы паводзін у розных жыццёвых сітуацыях. Сям'я прытрымліваецца традыцый, абапіраючыся на пэўныя узоры дзейнасці, без якіх немагчыма яе развіццё.

Выхаваўчы патэнцыял народных традыцый садзейнічае станаўленню асобы, забяспечвае трансляцыю сацыяльнага вопыту і пераемнасць духоўных каштоўнасцей. Існуе шмат азначэнняў паняцця "традыцыя". Традыцыя характарызуецца як сацыяльная і культурная спадчына, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне і якой прытрымліваюцца ў пэўных грамадствах і сацыяльных групах на працягу доўгага часу. У "Беларускай энцыклапедыі" традыцыя вызначаецца як культурная спадчына народа, сусветных і рэгіянальных цывілізацый, якія актуалізуюцца ў кантэксце сучаснасці, служаць асновай для развіцця нацыянальнай культуры і надаюць ёй цэласнасць і самабытнасць [1, с. 46]. У гэтым даследаванні мы абапіраемся на паняцце, згодна з якім традыцыя – гэта звычаі, парадкі, правілы, паводзіны і погляды, якія складваюцца гістарычна ў жыцці кожнага народа ці калектыву, перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

Сёння вывучэнне народнай культуры – важны напрамак як у педагагічнай навуцы, так і ў жыцці грамадства ў цэлым, асабліва ў плане выхавання моладзі разам з моднымі тэндэнцыямі ўспрымання карціны свету праз заходнія традыцыі і масавую культуру. Сістэма традыцый этнасу з'яўляецца вынікам выхаваўчых намаганняў на працягу стагоддзяў, перадачы сацыяльна значных ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, навыкаў, якія стагоддзямі складваліся пад уздзеяннем нацыянальнай культуры і былі накіраваныя на захаванне і памнажэнне народнага вопыту. У рамках фарміравання ў студэнцкай моладзі сямейнай культуры неабходна выкарыстоўваць яркія прыклады традыцый народнай педагогікі, сямейнай абраднасці і свят беларускага народнага календара.

Мэта даследавання – у тэарэтычным абгрунтаванні выхаваўчага патэнцыялу беларускіх народных традыцый і ўкараненні яго ў практычную дзейнасць па фарміраванні сямейнай культуры сучаснай моладзі.

**Сутнасць паняцця "выхаваўчы патэнцыял беларускіх народных традыцый".** Пад выхаваўчым патэнцыялам народных традыцый мы разумеем закладзеныя ў змест народных традыцый сямейнай абраднасці, педагогікі і каляндарных свят магчымасці для мэтанакіраванага фарміравання сямейнай культуры і вырашэння актуальных праблем шлюбна-сямейнага інстытута.

У сям'і адбываецца выхаванне асобы ў адпаведнасці з каштоўнасцямі, нормамі, звычаямі свайго народа і сямейнымі традыцыямі. Выхаванне ў сям'і займае адно з важных месцаў, уяўляе сабой выхаваўчую культуру, розную ў кожнай асобнай сям'і.

Выхаваўчая культура сучаснага грамадства – прэфігуратыўная (у якой не толькі дзеці вучацца ў бацькоў, але і бацькам даводзіцца вучыцца ў сваіх дзяцей) па пераважнасці з элементамі культуры канфігуратыўнага тыпу. Менавіта таму фарміраванне сямейнай культуры ў асяроддзі студэнцкай моладзі, якая з'яўляецца неад'емнай часткай сваёй сям'і, важна ажыццяўляць на аснове народных традыцый.

Народныя традыцыі – сацыяльна-культурны феномен, які выконвае важныя функцыі. Традыцыі аб'ядноўваюць прадстаўнікоў пэўнай этнічнай супольнасці, звязваюць пакаленні людзей дзякуючы сваёй устойлівасці і паўтору, рэгулююць паводзіны, узаемаадносіны людзей паміж сабой, бо ўтрымліваюць у сабе маральна-этычныя нормы, правілы гаспадарчай дзейнасці, прынцыпы выхавання дзяцей і г.д.

Функцыі народных традыцый – камунікатыўная, эмацыянальна-псіхалагічная, ідэалагічная, духоўная, кампенсацыйная і маральна-выхаваўчая – рэалізуюцца ў творчай дзейнасці па адаптацыі свят беларускага народнага календара для сучаснай сям'і, што дазваляе захаваць пераемнасць пакаленняў у працэсе арганізацыі сумеснага вольнага часу. Гэтыя функцыі з'яўляюцца значнымі ў беларускай народнай педагогіцы, дзе выхаванне грунтуецца на правілах паводзін кожнага асобнага члена сям'і.

Народныя традыцыі з'яўляюцца сродкам выхавання лепшых якасцей нацыянальнага характару беларусаў, развіцця маральнай, нацыянальна свядомай асобы, якая ў будучыні створыць сваю сям'ю. Вывучэнне і інтэрпрэтацыя беларускіх народных традыцый дапаможа раскрыць іх выхаваўчы патэнцыял і арганізаваць у творчую дзейнасць па рацыянальным выкарыстанні на практыцы яе каштоўнасцей, сугучных сучасным мэтам выхавання і фарміравання сямейнай культуры студэнцкай моладзі.

Выхаваўчы патэнцыял народных традыцый у фарміраванні сямейнай культуры сучаснай моладзі складаецца ў:

• зацвярджэнні пераемнасці пакаленняў, калі старэйшае пакаленне перадае маральна-эстэтычныя каштоўнасці сям'і малодшаму пакаленню;

• традыцыях арганізацыі і правядзення народных свят ("Багач", "Шчодры вечар", "Вялікдзень" і г.д.), у якіх раскрываюцца маральныя, эстэтычныя, светапоглядныя, псіхалагічныя характарыстыкі беларускага народа;

• традыцыях сямейнай абраднасці (вясельныя, радзільныя і памінальныя абрады), якія вызначаюць і рэгулююць сферы жыцця людзей, спрыяюць фарміраванню каштоўнаснага стаўлення да сям'і;

• камунікатыўных магчымасцях традыцый народнай педагогікі (правілы паводзін, роўныя правы і абавязкі членаў сям'і, роля мужчыны і жанчыны, асаблівасці паводзін і адносіны паміж бацькамі, працоўнае выхаванне, аўтарытэт і павага бацькоў, этнічная самасвядомасць і г.д.), якая з'яўляецца асновай выхавання асобы;

• спецыяльна арганізаванай творчай дзейнасці студэнцкай моладзі па правядзенні свят у сваёй сям'і на аснове народных традыцый.

Традыцыі, звычаі, абрады можна разглядаць толькі ў цеснай узаемасувязі, бо ў рэальным жыцці яны існуюць у своеасаблівай іерархіі. Традыцыі стаяць на больш высокай ступені абагульнення маральна-этычных патрабаванняў, а звычаі і абрады, насычаныя эмацыянальна-эстэтычнымі матывамі, складаюць дзейсны сродак для фарміравання сямейнай культуры сучаснай моладзі.

Сямейная культура асобы фарміруецца праз традыцыі сямейнай абраднасці, беларускай народнай педагогікі і свят беларускага народнага календара.

**Традыцыі сямейнай абраднасці беларусаў.** Традыцыі сямейнай абраднасці ўтрымліваюць тэарэтычныя і практычныя арыенціры для сям'і ў выбары пэўных паводзін і дзеянняў у адпаведнасці з сямейнай абраднасцю беларусаў. Крыніцай для фарміравання кампанентаў сямейнай культуры асобы выступаюць звычаі і абрады, якія маюць пэўнае значэнне і арыентуюць сучасную моладзь на захаванне народных традыцый, пашырэнне сваіх ведаў аб сямейных традыцыях.

Важная роля ў гэтым даследаванні адводзіцца калектыўнай працы беларускіх навукоўцаў "Сям'я і сямейны побыт беларусаў", у якой Т.І. Кухаронак у раздзеле "Сямейная абраднасць беларусаў" дала характарыстыку радзільным, вясельным і пахавальным абрадам, а таксама разгледзела сучасныя формы іх існавання [2].

Сямейная абраднасць беларусаў ахоплівае найбольш важныя вехі ў жыцці чалавека: нараджэнне, уступленне ў шлюб, смерць. У адпаведнасці з гэтым існуюць тры формы абраднасці: радзільная, вясельная і пахавальная. Даследаванні асобных абрадавых комплексаў па працах Т.І. Кухаронак "Радзінныя звычаі і абрады беларусаў", М.М. Мікольскага "Паходжанне і гісторыя беларускай вясельнай абраднасці", В.М. Сысава "Беларуская пахавальная абраднасць" дапамаглі нам вызначыць выхаваўчы патэнцыял сямейнай абраднасці для фарміравання сямейнай культуры сучаснай моладзі.

Звычаі і абрады радзільнага цыкла адыгрывалі велізарную ролю з самых старажытных часоў. Поўнае ўяўленне аб структуры радзільных рытуалаў беларусаў даюць матэрыялы XIX стагоддзя. Т.І. Кухаронак у раздзеле "Радзінныя звычаі і абрады" пятага тома "Беларусы" выдзеліла тры цыклы радзільнай абраднасці: дародавы, родавы і паслеродавы. Першыя два цыклы змяшчаюць традыцыі, абрадавыя дзеянні, накіраваныя на захаванне цяжарнасці і паспяховыя роды, а пасляродавы цыкл – на прыняцце нованароджанага ў сям'ю (імянарачэнне дзіцяці; наведванне парадзіхі; выбар кумоў; абрад далучэння дзіцяці да хатняга ачагу, які папярэднічаў царкоўнаму Хрышчэнню; святкаванне хрэсьбін; першае пастрыжэнне, слова, крок; з'яўленне першага зуба). Дзіця ў традыцыйнай культуры беларусаў з'яўлялася неад'емнай часткай прыроды, яго зачацце і нараджэнне суправаджалася перасцярогамі і правіламі паводзін жанчын у перыяд цяжарнасці: не падымаць цяжару, не зацягваць туга вопратку, баяцца ўдараў і г.д. [3]. Веданне радзільнай абраднасці дапаможа сучаснай моладзі ўсвядоміць каштоўнасць сям'і, нараджэння дзяцей і іх выхавання ў адпаведнасці з народнымі традыцыямі. Практычнае выкарыстанне ў сваёй будучай сям'і радзільнай абраднасці будзе больш усвядомленым, калі сэнс кожнага дзеяння будзе зразумелы.

На вясельную абраднасць адводзіўся значны перыяд часу, неабходны для арганізацыі і правядзення ўсіх яе традыцый. Стварэнню новай сям'і з даўніх часоў надавалася вялікая ўвага. Пачынаўся вясельны абрад сватаннем. Пасля атрымання адабрэння, праз два-тры дні праходзілі "заручыны", на якіх збіраліся бацькі жаніха і нявесты. Пасля знаёмства бацькоў і іх згоды на вяселле дамаўляліся аб часе яго правядзення. Вяселле гулялі некалькі дзён, а завяршалася ўсё "пярэзвамі", калі на працягу тыдня або больш госці маладога і

малады запрашалі адзін аднаго ў госці. Таксама праходзілі абрады “пасада” і “каравай”. М.М. Нікольскі злучаў у караваі бога ўрадлівасці, бога любові і бога духа продкаў. На вяселлі дзеці і моладзь чулі песенныя павучанні маці сыну, у якіх яна казала пра неабходнасць выбару ў жонкі не багатай, а добрай, разумнай і працавітай дзяўчыны: “Мы на яе сваё золата ўложым, а мы ж ёй свайго розуму не ўложым”. Жонка павінна была паважаць меркаванне мужа і яго бацькоў, усяляк дапамагаць ім, быць добрай маці [4]. У цэлым вясельная абраднасць уяўляла сабой маляўнічае тэатралізаванае дзеянне, у якім з задавальненнем удзельнічалі не толькі маладыя, але і госці. Сучаснай моладзі, якая ў будучыні створыць свае сем’і, неабходна ведаць традыцыі вясельнай абраднасці, каб у далейшым адаптаваць іх для правядзення ўласнага вяселля. Элементы народных традыцый у сучасным вяселлі дапамогуць разнастаіць урачыстасць, напоўніць дзеянні сэнсам для ўмацавання шлюбна-сямейнага саюзу маладых, на што і былі накіраваны традыцыйныя вясельныя абрады.

Беларускія народныя пахавальна-памінальныя звычаі і абрады раскрываюць сутнасць абрадаў, звязаных са смерцю і памінаннем чалавека, і складаюцца з дзвюх частак: пахаванне памерлага і памінальныя дні. З мэтай абудзіць пачуццё прыналежнасці да свайго роду дзяцей актыўна далучалі да ўдзелу ў абрадзе памінання памерлых. На “Радаўніцу”, “Траецкія”, “Змітраўскія дзяды” прыводзіліся ў парадак магілы сваякоў, прыбіралі ў доме, апраналі чыстую вопратку, садзіліся за памінальны стол з запрашэннем “дзядоў” падзяліць трапезу, выказваючы тым самым надзею на дапамогу продкаў-заступнікаў у сельскагаспадарчай дзейнасці. Пастаянным напамінам, увасабленнем памяці аб продках служылі дрэвы на могілках, каля дома. Дрэвы ўспрымаліся як знак прыналежнасці да зямлі продкаў, як сімвал жыцця. Веданне пахавальна-памінальных абрадаў будзе спрыяць паважліваму стаўленню да продкаў, шанаванню памерлых [5].

**Традыцыі народнай педагогікі.** Фарміраванне сямейнай культуры моладзі цяжка ўявіць без народнай педагогікі як педагогікі жыцця, выхаваўчай практыкі на працягу многіх стагоддзяў. Народная педагогіка – гэта сістэма каштоўнасцей, якая дазваляе выхаваць асобу з пэўнай нацыянальнай ідэнтычнасцю. Працэс выхавання асобы ў народнай педагогіцы складаецца з правілаў, нормаў паводзін, перакананняў, узаемаадносін паміж членамі сям’і і г.д., якія садзейнічаюць фарміраванню культуры зносін у сям’і ў сучаснай моладзі.

Беларуская народная педагогіка абапіраецца на абагульненыя погляды беларусаў на выхаванне і яго ролю ў развіцці розуму, волю і характару чалавека. Паводле фалькорных твораў (казак, песень, прымавак і інш.), ідэалам беларуса з’яўляецца добры, працавіты, гасцінны, фізічна здаровы, сумленны і гуманны чалавек: “Не той харош, хто прыгож, а той харош, хто да справы гож”, “Хлуснёй багаты не будзеш”, “Здароўе даражэй за ўсё” і г.д. У мінулым дзеці ў беларускіх сем’ях вельмі добра ведалі “азбуку жыцця”, працавалі нароўні з дарослымі, рана ўсведамлялі адказнасць за свае ўчынкі і неабходнасць працы, паважалі дарослых і клапаціліся аб малодшых.

Асаблівым у народнай педагогіцы беларусаў быў прынцып выхавання ў суадносінах з прыродай, які мы можам прасачыць на прыкладзе твораў народнай творчасці (казкі, прымаўкі і г.д.), любоў да зямлі, роднага краю фарміравалася з ранняга дзяцінства, якое праходзіла на ўлонні прыроды. Рост і развіццё дзіцяці параўноўвалі з развіццём прыроды, што праходзіць чырвонай ніццю ў вуснай народнай творчасці: “Гні дрэўца, пакуль гнецца”, “Гні галінку, пакуль маладзенькая”, “Расце на лес гледзячы”.

Працоўнае выхаванне з’яўляецца часткай народнай педагогікі. У сям’і працоўнае выхаванне суправаджалася святамі і абрадамі, што характарызавалася імкненнем людзей зрабіць цікавым і разнастайным не толькі вольны час, але і цяжкую працу. Кожнае беларускае свята, сямейная падзея, звяно каляндарна-аграрнага цыкла праходзіць не толькі з песнямі, выкананнем пэўных дзеянняў, але і з танцамі як сродкам народнай педагогікі. Танцавальнае мастацтва цесна звязана з жыццём народа: малюнкам танцавальных рухаў людзі перадавалі звычкі птушак, жывёл, аднаўлялі працэс працы. Напрыклад, у танцы “Грачанкі” перадаваўся працэс замешвання цеста і выпечкі аладак, а ў танцы “Кросны” адлюстроўваўся рух ніткі ў працэсе ткацтва, у танцы “Мельнік” – рух жорнаў млына, “Мяцелачка” – жэсты чалавека, які мяце, і г.д. Народныя танцы адлюстроўваюць паўсядзённае жыццё чалавека, яго побыт, што дапамагае сучаснай моладзі ў арганізацыі культуры сямейнага асяроддзя (кагнітыўны і аксіялагічны кампаненты сямейнай культуры).

**Святы беларускага народнага календара.** Выхаваўчы патэнцыял свят беларускага народнага календара раскрываецца праз народныя традыцыі, якія прадстаўляюць увесь спектр звычаяў, рытуалаў, цырыманіялаў, сімвалаў і атрыбутаў. Кожнае свята беларускага народнага календара мае сваю тэму,

якая адлюстроўвае гісторыю народа. Святы – гэта падзеі, факты, культура людзей, норавы, звычаі, традыцыі агульнанацыянальнага і рэгіянальнага характару. Сукупнасць народных свят і традыцый уяўляецца нам як педагагічная сістэма, звязаная з сямейным выхаваннем і працай устаноў адукацыі, асабліва калі яна будуецца на аснове народных традыцый. Падчас свята чалавек атрымлівае душэўнае ўзвышэнне і прасвятленне, раскрываюцца яго творчыя сілы. Менавіта свята падпарадкоўваецца значным прынцыпам, такім як усеагульнасць, выкарыстанне актыўнасці і самадзейнасці чалавека, дыферэнцыраваны падыход да ўдзельнікаў, свабодны выбар разнастайных сюжэтаў, роляў святочнага дзеяння.

"Каляды", "Масленіца", "Вялікдзень", "Радаўніца", "Сёмуха", "Купалле", "Дзяды" – народныя святы, якія рэгулявалі ўклад жыцця беларусаў на працягу года. Падчас падрыхтоўкі да святкавання людзі імкнуліся наладзіць гармонію ў сям'і, прынесці радасць блізкім, стварыць цёплую і ўтульную атмасферу ў доме, правесці разам час. Святы беларускага народнага календара дапамагалі зразумець сэнс паўсядзённага жыцця, каштоўнасці сям'і [6].

"Зажынкі" і "Дажынкі" выхоўваюць беражлівыя адносіны да вынікаў працы. З першых сціснутых каласкоў рабілі невялікі сноп і неслі яго дадому, ставілі на ганаровае месца ў кут, дзе ён знаходзіўся да таго часу, пакуль не пачыналі малаціць жыта. Збожжа першага снапа насыпалі ў кошык, ставілі ў яго свечку і абносілі хаты на "Багач", каб забяспечыць кожнай сям'і дабрабыт. З апошніх каласкоў падчас "Дажынак" рабілі "бараду" на ніве, якую ўпрыгожвалі кветкамі і каляровымі стужкамі. Потым пад гукі сярпоў і песень жнеі неслі сноп гаспадару і ставілі на кут з тым, каб пачаць пасяўную збожжам "барады" "Багача". Апошні сноп гэтага ўраджаю станавіўся першым для наступнага, што з'яўлялася сімвалам пераемнасці працоўных намаганняў і іх вынікаў [7].

З пачаткам ткацкіх работ у асеннезімовы перыяд дзяўчаты "наймалі" дом, дзе праводзіліся "Вячоркі" ("супрадкі, попрадкі"). Дадзены звычай дазваляў ім самастойна падрыхтаваць дом да свята, займацца ткацтвам, у працэсе чаго адбывалася фарміраванне культуры сямейнага асяроддзя. Для моладзі стварэнне добраўпарадкаванага сямейнага асяроддзя ў доме з атмасферай кахання і дабрыні з'яўляецца залогам моцнай сям'і, дзе ўсе яе сябры знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі.

Святы беларускага народнага календара і абрады з'яўляюцца сродкам выказвання перакананняў, настрою і светапогляду асобы, паказваюць і паглыбляюць яе пачуцці. Кожнае свята беларускага народнага календара напоўнена шматлікімі абрадамі і звычаямі, прыкметамі і павер'ямі, гульнямі і песнямі. Менавіта таму мы бачым глыбокі выхаваўчы патэнцыял свят народнага календара ў фарміраванні сямейнай культуры моладзі, здольнай з дапамогай абрадаў і звычаяў арганізаваць сумесны вольны час у сям'і.

**Заключэнне.** Выхаваўчы патэнцыял народных традыцый уключае ў сябе канкрэтныя традыцыі сямейнай абраднасці, педагогікі і народных свят згодна з маральным ідэалам народа. Шматразовы паўтор абрадавых дзеянняў фарміруе звычкі, якія дазваляюць моладзі выкарыстоўваць іх у сваім жыцці. Звыклыя спосабы паводзін, выпрацаваныя ў зносінах з членамі сям'і, сумесным вольным часе і стварэнні спрыяльнага сямейнага асяроддзя пры выкананні звычаяў і абрадаў, дапамагаюць сучаснай моладзі аб'яднаць сям'ю.

Такім чынам, народныя традыцыі, якія існуюць у форме звычаяў, абрадаў, ідэй, нормаў жыццядзейнасці, перадаюць багатую спадчыну ведаў, прынцыпаў і правілаў паводзін чалавека, спрыяюць фарміраванню сямейнай культуры моладзі. Лепшыя прыклады народных традыцый беларусаў, правераныя стагоддзямі, валодаюць выхаваўчай практыкай цэлага народа, якую варта не толькі вывучаць, але і трансфарміраваць пад рэаліі сучаснага грамадства. Умацаванне асноў сям'і і фарміраванне сямейнай культуры сучаснай моладзі сёння павінна грунтавацца на беларускіх народных традыцыях.

### ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн, 1996–2004. – Т. 15. – 2002. – 550 с.

2. Кухаронак, Т.І. Каляндарныя абрады як аб'ект нематэрыяльнай культурнай спадчыны / Т.І. Кухаронак // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2011. – Вып. 10. – С. 376–380.

3. Кухаронак, Т. Радзіны і маленства ў традыцыйнай культуры беларусаў / Т. Кухаронак. – Мінск: Беларус. навука, 2017. – 139 с.

4. Дзіцячы фальклор: зб. фальклор. матэрыялаў / Беларус. дзярж. пед. ун-т; рэдкал.: У.А. Васілевіч [і інш.]. – Мінск: БДПУ, 2006. – 359 с.

5. Крываносава, А.Э. Выхаваўчы патэнцыял беларускіх народных традыцый, звычаяў, абрадаў, свят / А.Э. Крываносава // Весн. Віцеб. дзярж. ун-та. – 2006. – № 4. – С. 50–56.

6. Гуд, П.А. Новыя народзіны традыцыйнай святочнай культуры Беларусі: традыцыі і навацыі, тэндэнцыі развіцця / П.А. Гуд, Н.І. Гуд // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2017. – № 1. – С. 140–145.

7. Міцкевіч, П. Беларускія дажынкі: сувязь мінулага з сучасным / П. Міцкевіч // Нар. асвета. – 2009. – № 9. – С. 80–83.

*Паступіў у рэдакцыю 21.09.2021*